**А. А. Гулак,**
*старшы выкладчык кафедры*
*рэжысуры абрадаў і свят,*
*кандыдат філалагічных навук*

# РАЗВІЦЦЁ АКАДЭМІЧНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ТРАДЫЦЫЙНАЯ СВЯТОЧНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСАЎ»

Падрыхтоўка студэнтаў па спецыяльнасці 1-17 01 05-01 Рэжысура свят (па напрамках) ажыццяўляецца ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі, які прадугледжвае фарміраванне наступных груп кампетэнцый: *акадэмічныя, сацыяльна-асобасныя, прафесійныя.* Акадэмічныя кампетэнцыі спецыяліста вызначаюць тыя параметры, якія акрэсліваюць уласна веды і ўменні па засвоеных вучэбных дысцыплінах, гэта значыць фарміруюць здольнасці аперыраваць базавымі навукова-тэарэтычнымі ведамі для рашэння тэарэтычных, практычных і творчых задач; валодаць даследчымі навыкамі; працаваць самастойна і прымаць прафесійныя рашэнні; крытычна ацэньваць розныя канцэптуальныя палажэнні і высновы, сцверджаныя ў сучаснай навуцы і культурнай практыцы.

Заўважым, што вучэбная дысцыпліна «Традыцыйная святочная культура беларусаў» ахоплівае вельмі значнае праблемнае поле: гэта фарміраванне светапогляду носьбітаў традыцыйнай культуры, сістэма народных вераванняў, ведаў пра сусвет, матэрыяльная культура ва ўсёй яе разнастайнасці, абрадава-святочная культура і неад’емная ад яе культура штодзённасці. Фарміраванне акадэмічных кампетэнцый у межах дысцыпліны «Традыцыйная святочная культура беларусаў» не можа быць рэалізавана без грунтоўнага пераасэнсавання і перагляду фонду, метадычных матэрыялаў, што выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе. Сёння трэба крытычна ставіцца не толькі да тэарэтычных пазіцый аўтараў самых распаўсюджаных падручнікаў (напісаных пераважна ў савецкі час для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей устаноў вышэйшай адукацыі), але і да зместу хрэстаматый па беларускім фальклоры (апошняя выйшла ў свет у 1996 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трэба адзначыць, што да пачатку 2000-х гг. у айчыннай навуковай традыцыі, сфарміраванай пераважна навукоўцамі аддзела фалькларыстыкі акадэмічнага Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, дамінавала вузкае разуменне фальклору як вуснай народнай творчасці, мастацтва слова і нават «народнай паэзіі». Аднак распаўсюджванне ідэй антрапалагічнай фалькларыстыкі паступова прывяло да таго, што да традыцыйных (філалагічных) метадаў даследавання фальклорнага матэрыялу падключаюцца метады семіятычныя і культуралагічныя. Фальклорныя з'явы сталі разглядацца без уліку эстэтычных крытэрыяў і па-за межамі традыцыйных жанраў. Паслядоўнае выкарыстанне метадалогіі сумежных народазнаўчых дысцыплін, «антрапалагізацыя» беларускай фалькларыстыкі дазваляюць прыступіць да ўсебаковага даследавання традыцыйнай святочнай культуры як цэласнай гісторыка-культурнай з'явы, даюць магчымасць комплексна, інтэгратыўна вывучаць працэсы, якія адбываюцца ўнутры фальклорнай традыцыі.

Магчымасць прадэманстраваць студэнтам сегменты традыцыйнай святочнай культуры, зафіксаваныя ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі навукі, даюць публікацыі шэрагу сучасных айчынных даследчыкаў. Сярод іх варта адзначыць аўтарскі калектыў серыі «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» (у 6 тамах, 10 кнігах): Т. Варфаламеева, Т. Валодзіна, В. Лабачэўская, Т. Кухаронак, М. Козенка, А. Боганева, В. Басько і інш. Аўтэнтычнасць тэкстаў, дакладная перадача дыялектных асаблівасцей і індывідуальнай манеры прамовы інфармантаў, увага да кантэксту і асабістых перажыванняў носьбітаў традыцыі, шырокі рэгіянальны ахоп матэрыялаў стварае аб'ёмную панараму існавання традыцыйнай беларускай культуры, у тым ліку святочнай.

Вялікі інфарматыўны патэнцыял для фарміравання акадэмічных кампетэнцый студэнтаў мае Нацыянальны Інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі, створаны пры фінансавай і кансультатыўнай падтрымцы ЮНЕСКА (база даных і інтэрнэт-рэсурс «Жывая спадчына Беларусі»). «Гэта не толькі база даных і адпаведны сайт, – піша А. Сташкевіч, – а ў першую чаргу многія арганізацыі, эксперты і носьбіты спадчыны з усіх рэгіёнаў Беларусі. Інвентар пастаянна папаўняецца новымі элементамі, "вырошчваецца" супольнасцямі, групамі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асобнымі людзьмі, зацікаўленымі ў такой далікатнай матрыцы культуры» [2, с. 4].

Фальклорныя архівы з’яўляюцца неацэнным скарбам народнай спадчыны і інфармацыйнай крыніцай для фарміравання акадэмічных кампетэнцый студэнтаў. Калекцыі фальклорных запісаў аддзела славістыкі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору (ІМЭФ) Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (найбольш буйныя ў краіне) аб’яўлены навуковымі аб’ектамі, якія складаюць нацыянальны здабытак (пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 жніўня 2001 г. № 1137). Фальклорны архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору (далей – фальклорная калекцыя) – філіяла дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры» пачаў фарміравацца з моманту заснавання інстытута ў 1957 г. Сёння фальклорная калекцыя мае архівы: фонд тэкставых запісаў; калекцыя фотаматэрыялаў; калекцыя нотных варыянтаў (расшыфровак мелодый); фонд фоназапісаў. Усяго фальклорная калекцыя налічвае больш за 400 тысяч тэкставых запісаў твораў розных відаў і жанраў беларускага фальклору і ўвесь час папаўняецца [2]. Большасць запісаў – унікальныя, непаўторныя, якія былі зафіксаваны ў жывым бытаванні (значная колькасць з іх зроблена ў раёнах, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС). Аддзелам фальклорыстыкі і культуры славянскіх народаў ІМЭФ, у склад якога ўваходзіць сектар аховы фальклорнай спадчыны, распрацоўваецца канцэпцыя ўключэння фальклорнай калекцыі ў навучальную, адукацыйную і культурна-асветніцкую прастору Рэспублікі Беларусь і за яе межамі.

Істотным момантам у фарміраванні акадэмічных кампетэнцый з’яўляецца фармуліроўка канцэпцыі развіцця дыпломных даследаванняў на кафедры рэжысуры абрадаў і свят і стратэгіі размеркавання гэтых тэм з улікам асаблівасцей тых гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў, дзе будуць рэалізоўвацца дыпломныя праекты. Для таго, каб пазбегнуць аднабаковасці і звужэння праблематыкі дыпломных даследаванняў, неабходна ўлічваць, што сучасная навука і культурная практыка даюць шырокае поле для эксперымента і адкрыцця і не мінаць дыскусійных ці маладаследаваных тэм. Такія тэмы могуць быць паспяхова распрацаваны ў дыпломных праектах і даць арыгінальныя і змястоўныя вынікі. У якасці прыкладу можна назваць тэмы па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народна-рэлігійнай святочнай культуры, якая замоўчвалася ў савецкі час ці інтэрпрэтавалася тэндэнцыйна. Гэта фэсты (храмавыя святы), абрадавыя практыкі ўшанавання культавых аб'ектаў, многія з якіх унесены ў Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, напрыклад Будслаўскі фэст у в. Будслаў Мядзельскага раёна Мінскай вобласці, абрад «Варварынская свяча» ў в. Басценавічы Мсціслаўскага раёна і інш. У Спіс сусветнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА ўнесены беларускі абрад «Калядныя цары» з в. Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці.

Такім чынам, з улікам шырыні праблемнага поля традыцыйнай святочнай культуры беларусаў, тэарэтычных здабыткаў сучаснай навукі і пазітыўнага вопыту работы ўстаноў і арганізацый у сферы навукі і культуры Беларусі фарміраванне акадэмічных кампетэнцый студэнтаў спецыяльнасці 1-17 01 05-01 Рэжысура свят (па напрамках) мае вялікі патэнцыял развіцця.

*1.* Отдел фольклористики и культуры славянских народов : История отдела [Электронный ресурс]. – Мінск, 2012. – Режим доступа: http://www.imef.basnet.by/folkist.html.

*2. Сташкевіч, А.* Уводзіны / Жывая спадчына Беларусі : нацыянальны інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі : каталог / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Ін-т культуры Беларусі ; [уводзіны А. Сташкевіча] – Мінск : Інбелкульт, 2014. – 163 с.

**И. В. Ефремова,**
*доцент кафедры режиссуры эстрады,*
*кандидат искусствоведения*

## ИЗУЧЕНИЕ ДИСЦИПЛИНЫ «СВЕТСКИЙ ЭТИКЕТ» КАК НЕОБХОДИМОЕ УСЛОВИЕ ВОСПИТАНИЯ СПЕЦИАЛИСТА В ОБЛАСТИ КУЛЬТУРЫ

Одной из актуальных проблем современного процесса образования является кардинальное реформирование традиционной образовательной системы. В результате поиска путей для реализации программы модернизации образования появилось понятие компетентностного подхода.

Суть компетентностного подхода сводится к умению учащихся решать проблемы разной сложности, основываясь на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ